# ПАЛАЖЭННЕ
## аб раённым конкурсе чытальнікаў
## да 120-годдзя з дня нараджэння Язэпа Пушчы
## “Я за дабро плачу дабром”

1. Агульныя палажэнні

1.1. Сапраўднае Палажэнне вызначае мэту, задачы і парадак раённага конкурса чытальнікаў Мінскага раёна “ Я за дабро плачу дабром ” (далей – конкурс).

1.2. Арганізатарамі па падрыхтоўцы і правядзенні конкурса з’яўляецца ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”.

2. Мэты і задачы конкурсу.

2.1. Галоўная мэта – фарміраванне ў падлеткаў пачуцця патрыятызму і гонару за сваю Радзіму праз прыцягненне да творчай дзейнасці.

2.2. Задачы конкурса: развіццё і падтрымка літаратурных здольнасцей таленавітай моладзі; стымуляванне творчай самарэалізацыі асобы маладога чалавека; адкрыццё новых паэтычных імёнаў; папулярызацыя творчасці сучасных беларускіх пісьменнікаў; фарміраванне духоўнай культуры, пачуцця патрыятызму і гонару за Беларусь.

3. Парадак правядзення.

3.1. Відэа-ролік з інвідуальным выступленнем.

3.2. Выступленне павінна быць прадстаўлена адным творам.

3.3. Час выступлення чытальніка - да 3 хвілін.

3.4. Кожны ўдзельнік выступае індывідуальна, калектыўнае прачытанне вершаў не прадугледжана.

3.5. У якасці фону дэкламацыі верша можна выкарыстоўваць атрыбуты, якія адпавядаюць тэме верша, музычнае суправаджэнне і іншыя аўдыёвізуальныя сродкі.

3.6. Узрост удзельнікаў ад 10 да 15 гадоў.

4. Тэрміны і парадак правядзення Конкурсу

4.1. Для ўдзелу ў Конкурсе неабходна падаць заяўку да 10 мая 2022 г. на электронную пошту ДУ "Мінская раенная центральная бібліятэка" mrcbibl@mail.ru. Конкурсныя работы прымаюцца да 17 мая на электронную пошту ДУ "Мінская раенная центральная бібліятэка" mrcbibl@mail.ru!

4.2. Матэрыялы-прадстаўленні (заяўка) ўключаюць наступныя звесткі:

-прозвішча, імя і імя па бацьку ўдзельнікаў;

-узрост;

-прыналежнасць да бібліятэкі;

-нумары кантактных тэлефонаў;

-эл.пошта

5. Конкурс будзе праходзіць 20 мая 2022 года ў анлайн-фармаце.

6. Узнагароджванне

6.1. Пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені.

6.2. Па рашэнні журы могуць быць устаноўлены спецыяльныя дыпломы удзельнікам, якія праявілі асобныя выдатныя якасці.

6.3. Журы мае права прысудзіць адно месца некальнкім удзельнікам, прысуджаць не ўсе месцы. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.